ФАТОГРАФ-ВЫНАХОДНІК

СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ

Кожнага, хто уважліва знаёміцца з экспанатамі абласнога краязнаўчага музея, не могуць пакінуць раўнадушным фотаздымкі старога Віцебска. Глядзіш на іх і здзіўляешся: вось якімі непрыкладнымі былі многа год назад вуліцы і плошчы.

Стары Віцебск... Навалікія вулачкі, і як найвялікшае цуда тэхнікі — першы трамвайны вагон. На многіх з гэтых фотаздымкаў стаіць подпіс: «Фота С. Юркоускага».

Хто гэты чалавек, які зрабіў для гісторыі вобразік старажытнага Віцебска?

Сігізмунд Антонавіч Юркоускі — наш зямляк. Ён вядомы не толькі як майстар фатаграфіі таго часу, але і як вынаходнік.

У 1878 годзе ў Расіі ствараецца пяты аддзел Рускага тэхнічнага таварыства. Яго мэта: займацца пытаннямі развіцця і папулярызацыі фотасправы ў краіне. Членамі гэтага аддзела былі тыя, хто ўсведамляў важнасць далейшага развіцця фотасправы, яе ўдасканалення. Сярод іх быў і С. А. Юркоускі.

Вядома, што фотаапарат таго часу быў вельмі складаны і нязручны для карыстання. Таму многія фотааматары прабавалі неяк удасканаліць яго. Працаваў над гэтым і малавядомы віцебскі фотограф С. А. Юркоускі.

Ішлі доўгія і цяжкія гады пошукаў. Прабліскі удач чаргаваліся з расчараваннямі.

І вось першы поспех. У 1881—1882 гадах С. А. Юркоускі сканструяваў першы ў свеце маланкавадзеючы фатаграфічны затвор. Свае вынаходства прадэманстраваў у 1882 годзе на маскоўскім з'ездзе фотографаў. Гэты «затвор пры пласцінцы», як яго называў сам аўтар, даваў магчымасць адкрываць і закрываць аб'ектыў (як гэта было раней), а саму пласцінку. Гэта дасягалася пры дапамозе спецыяльнай шырмы-засаўкі, якая забяспечвала большую скорасць работы затвора.

Піянер рускай фатаграфіі настойліва працаваў пошукі. Хутка яму удалося удасканаліць сваё вынаходства. Цяпер яно атрымала назву «шторна-шчылінны затвор». Але найбольш уплывовыя члены пятага аддзела Рускага тэхнічнага таварыства не прызналі вынаходства Юркоускага. Яны лічылі, што гэтая навінка вельмі складаная для практычнага карыстання. Не дзіўна таму, што вытворчасць затвораў не была наладжана ў Расіі. Затое вынаходствам рускага фотографа зацікавіліся заходнееўрапейскія фірмы. Яны настойліва прапануюць ўкараніць яго за мяжой. І Юркоускі згаджаецца на іх выпуск англійскімі фірмамі. Затым у накалькі зменены выглядзе затвор выпусціла і нямецкая фірма «Герц». Аж да 20-х гадоў нашага веку у фатаграфічных апаратах выкарыстоўваліся затворы мадэлі нашага земляка.

С. А. Юркоускі быў добра знаёмы з І. Я. Рэпіным. Калі вялікі мастак у 1882 годзе пасяліўся ў сваім маёнтку пад Віцебскам, фотограф прыязджаў да яго. Ён сфатаграфаваў мастака і яго сябра А. В. Жыркевіча. На жаль, лёс гэтых фотаздымкаў невядомы. Большасць жа работ С. А. Юркоускага як фотографа не захавалася. Толькі нямногія з іх дайшлі да нашага часу і захоўваюцца цяпер у музеях Віцебска і Мінска.


А. ПАДЛІПСКІ.

У «СПАРТАКУ»

алюцыйнага фільма «Праме ім кінатэатры «Спартак». У епшыя савецкія фільмы, якія ейнасці У. І. Леніна, аб яго алюцыйнай барацьбы, аб па вецкага народа ў гады Вялі рацоўных подзвігах будаўні

устрэкуцца з ветэранамі Ка нікамі грамадзянскай і Вялі адавікамі вытворчасці.

Б. БАГАРАД.



«Кастрычнік» — «ЖЫВЫ ТРУП» (у дзвюх серыях) — 10-00, 12-40, 15-20, 18-00, 20-40.

«Мір» — «ЖЫВЫ ТРУП» (у дзвюх серыях) — 9-00, 11-20, 11-50, 14-10, 14-40, 17-00, 17-30, 19-50, 20-30.

«Усход» — «АННЫЧКА» — 10-00, 11-35, 13-10, 16-20, 17-55, 19-30, 21-10.

«Спартак» — ПАДАЮЧЫ ІНЕЙ» — 9-20, 11-05, 12-50 14-40, 16-30, 18-20, 20-10, 22-00. «ЦЯЖКІЯ СТАРТЫ МЕХІКА» — 11-40, 13-30, 15-20, 19-00, 21-00.

«Зара» — «ПАДАЮЧЫ ІНЕЙ» — 10-30, 12-20, 14-10, 16-00, 17-50, 19-40, 21-30.

«Дружба» — «ПАРА МАРАЎ» —